09.07.2024

Праект для грамадскага абмеркавання

# Арганічны закон Рэспублікі Беларусь Аб мясцовым самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь

прастора
законы . рэформы . канстытуцыя

## Змест

ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ......3
ГЛАВА 2. ФАРМАВАННІ ПРАДСТАЎНІЧЫХ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ......9
ГЛАВА 3. ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАДСТАЎНІЧЫХ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ...... 12
ГЛАВА 4. МАТЭРЫЯЛЬНАЯ І ФІНАНСАВАЯ АСНОВА МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ...... 26
ГЛАВА 5. ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСКАЕ САМАКІРАВАННЕ...... 30
ГЛАВА 6. ФОРМЫ ПРАМОГА НАРОДАЎЛАДДЗЯ......31
ГЛАВА 7. МІЖКАМУНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА...... 34
ГЛАВА 8. ГАРАНТЫІ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ. АДКАЗНАСЦЬ ОРГАНАЎ І СЛУЖБОВЫХ АСОБ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ......36
ГЛАВА 9. НАГЛЯД І КАНТРОЛЬ НАД ДЗЕЙНАСЦЮ І РАШЭННЯМІ ОРГАНАЎ І СЛУЖБОВЫХ АСОБ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ......36
ГЛАВА 10. ДЗЯРЖАЎНЫ НАГЛЯД ЗА ДЗЕЙНАСЦЬ ОРГАНАЎ І СЛУЖБОВЫХ АСОБ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ...... 38
ГЛАВА 11. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ......39

Праект[1] 09.07.2024

# Арганічны закон Рэспублікі Беларусь Аб мясцовым самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь

Гэтым Законам у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь вызначаюцца прававыя і арганізацыйныя асновы дзейнасці мясцовага самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь.

## ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### *Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія выкарыстоўваюцца ў законе*

1. Бюджэт грамадзянскага ўдзелу – спосабы і формы ўдзелу грамадзян у размеркаванні расходаў часткі бюджэту Грамады праз фінансаванне праектаў (грамадзянскіх ініцыятыў), прапанаваных жыхарамі Грамады і накіраваных на вырашэнне пытанняў мясцовага значэння.

2. Дапаможнае структурнае падраздзяленне Грамады - сацыяльна-тэрытарыяльная структура, якая бярэ на сябе рэалізацыю і аблягчае выкананне пэўных грамадскіх задач на частцы тэрыторыі Грамады. Яны могуць надзяляцца правамі юрыдычнай асобы. Да дапаможных структурных падраздзяленняў Грамады адносяцца, у прыватнасці, Раённыя адміністрацыі і Старасцінскія акругі.

3. Грамада - тэрытарыяльная супольнасць жыхароў населенага пункта або некалькіх населеных пунктаў, якая мае адзіны адміністрацыйны цэнтр, аб'яднаная агульнымі сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі інтарэсамі і мае права на самакіраванне, а таксама базавая адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь.

4. Дэлегаваная кампетэнцыя - паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай адміністрацыі, перададзеныя органам мясцовага самакіравання законам.

5. Дэпутат Рады, Сойміка - асоба, выбраная ў прадстаўнічы орган мясцовага самакіравання.

6. Камунальная ўласнасць - маёмасць, у тым ліку грашовыя сродкі, зямля і іншыя прыродныя рэсурсы, якія належаць Грамадзе, Павету і падуладныя створанымі імі органамі, камунальнымі прадпрыемствамі і ўстановамі. Камунальная ўласнасць складаецца з мясцовай казны і маёмасці, замацаванай за камунальнымі юрыдычнымі асобамі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

[1] Праект арганічнага Закона «Аб мясцовым самакіраванні» распрацаваны ў адпаведнасці з праектам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, распрацаваным Грамадскай канстытуцыйнай камісіяй https://prastora.info/be/constitution

7. Міжкамунальнае супрацоўніцтва Грамад і Паветаў - адносіны паміж двума або больш тэрытарыяльнымі грамадамі, якія ажыццяўляюцца на дамоўных пачатках у формах, прадугледжаных гэтым Законам.

8. Мясцовае самакіраванне - права і здольнасць мясцовых супольнасцяў самастойна, у межах закону і пад сваю адказнасць вырашаць пытанні мясцовага значэння, зыходзячы з інтарэсаў насельніцтва з улікам агульнадзяржаўных патрэб, гістарычных і культурных традыцый.

9. Мясцовы сход - сумесная прысутнасць групы грамадзян для абмеркавання пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця рэспубліканскага або мясцовага значэння.

10. Органы мясцовага самакіравання - органы, якія выбіраюцца непасрэдна насельніцтвам і (або) утвараюцца прадстаўнічым органам Грамады і Павета, надзеленыя ўласнымі паўнамоцтвамі па вырашэнні пытанняў мясцовага значэння. Органы мясцовага самакіравання не ўваходзяць у сістэму органаў дзяржаўнай улады.

11. Павет - Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка рэгіянальнага ўзроўню, якая прадстаўляе агульныя інтарэсы Грамад, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі.

12. Рада - прадстаўнічы орган самакіравання Грамады, які выбіраецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

13. Раённая адміністрацыя - дапаможнае падраздзяленне Грамады на тэрыторыі раёна ў гарадах з раённым дзяленнем.

14. Уласная кампетэнцыя органаў мясцовага самакіравання - паўнамоцтвы, прадастаўленыя органам мясцовага самакіравання Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым законам і іншымі законамі.

15. Соймік - прадстаўнічы орган самакіравання Павета, які выбіраецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

16. Старасцінская акруга - дапаможнае падраздзяленне Грамады, частка яе тэрыторыі, якая не ўключае адміністрацыйны цэнтр Грамады, на якой размешчаны адзін або некалькі населеных пунктаў, створаны з мэтай паляпшэння прадстаўніцтва інтарэсаў жыхароў акругі, які ўзначальвае стараста.

17. Тэрытарыяльнае грамадскае самакіраванне - органы, якія ствараюцца грамадзянамі на добраахвотнай аснове па месцы іх жыхарства на частцы тэрыторыі Грамады (тэрыторыі мікрараёнаў, жыллёвых комплексаў, кварталаў, вуліц, двароў, пасёлкаў, вёсак і інш.), якія дзейнічаюць у адпаведнасці з заканадаўствам, у мэтах вырашэння пытанняў мясцовага значэння.

18. Управа - выканаўчы і распарадчы орган Рады, Сойміка, падсправаздачны адпаведнай Радзе, Сойміку і які працуе на прафесійнай аснове. Выканаўчыя і распарадчыя органы з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі.

## *Артыкул 2. Сфера дзеяння гэтага Закона*

1. Дзеянне гэтага Закона распаўсюджваецца на:

1.1. тэрытарыяльныя супольнасці грамадзян - Грамады, Паветы ў іх дзейнасці па вырашэнні пытанняў мясцовага значэння непасрэдна, праз формы прамой дэмакратыі, або праз абраныя грамадзянамі прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання;

1.2. прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання, выканаўчыя і распарадчыя органы, якія фармуюцца імі, камунальныя прадпрыемствы і ўстановы, а таксама на абраных і прызначаных прадстаўнікоў органаў мясцовага самакіравання у іх дзейнасці па вырашэнні пытанняў мясцовага значэння;

1.3. органы дзяржаўнай улады і кіравання і іх прадстаўнікоў у частцы ўзаемадзеяння з органамі мясцовага самакіравання па вырашэнні пытанняў мясцовага значэння.

## *Артыкул 3. Асноўныя прынцыпы мясцовага самакіравання*

Мясцовае самакіраванне складае адну з асноваў канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, прызнаецца, гарантуецца на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляецца на прынцыпах:

народаўладдзя,

законнасці,

субсідыярнасці,

галоснасці і ўліку грамадскай думкі,

калегіяльнасці,

спалучэння мясцовых і дзяржаўных інтарэсаў,

выбарнасці,

прававой, арганізацыйнай і матэрыяльна-фінансавай самастойнасці ў межах паўнамоцтваў, вызначаных гэтым і іншымі законамі,

падсправаздачнасці і адказнасці органаў і службовых асоб перад тэрытарыяльнай супольнасцю,

дзяржаўнай падтрымкі і гарантыі мясцовага самакіравання,

судовай абароны правоў мясцовага самакіравання.

## *Артыкул 4. Прававая аснова мясцовага самакіравання*

Мясцовае самакіраванне арганізуецца і ажыццяўляецца на аснове Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства, а таксама міжнародных дамоваў Рэспублікі Беларусь.

## *Артыкул 5. Сістэма і формы мясцовага самакіравання*

1. Сістэма мясцовага самакіравання складаецца з двух тэрытарыяльных узроўняў: базавага (мясцовага) - Грамада і рэгіянальнага - Павет.

2. Грамада можа быць сельскай, сельска-гарадской ці гарадской і мае свае прадстаўнічыя і выканаўчыя органы.

3. Павет з'яўляецца аб'яднаннем па тэрытарыяльнай прыкмеце сельскіх, сельска-гарадскіх і гарадскіх Грамад, прадстаўляе іх агульныя інтарэсы, мае свае прадстаўнічыя і выканаўчыя органы.

4. Сістэма мясцовага самакіравання ўключае:

4.1. На базавым узроўні:

4.1.1. тэрытарыяльную Грамаду;

4.1.2. Раду;

4.1.3. Управу Грамады;

4.1.4. дапаможныя структурныя падраздзяленні Грамады;

4.1.5. органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

4.2. На рэгіянальным (павятовым) узроўні:

4.2.1. Соймік;

4.2.2. Управу Павета.

## *Артыкул 6. Асацыяцыі (саюзы) тэрытарыяльных Грамад, Паветаў*

1. Органы мясцовага самакіравання з мэтай больш эфектыўнага ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў, абароны правоў і інтарэсаў тэрытарыяльных Грамад, Паветаў могуць аб'ядноўвацца ў асацыяцыі (саюзы).

2. Органы мясцовага самакіравання і іх асацыяцыі могуць уваходзіць у міжнародныя асацыяцыі і іншыя добраахвотныя аб’яднанні органаў мясцовага самакіравання.

3. Асацыяцыям і іншым добраахвотным аб'яднанням органаў мясцовага самакіравання не могуць перадавацца паўнамоцтвы органаў мясцовага самакіравання.

## *Артыкул 7. Арганізацыйна-прававыя асновы мясцовага самакіравання*

1. Органы мясцовага самакіравання з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі і маюць уласныя паўнамоцтвы, у межах якіх дзейнічаюць самастойна і нясуць адказнасць за сваю дзейнасць у адпаведнасці з законам.

2. Матэрыяльнай і фінансавай асновай мясцовага самакіравання з'яўляецца камунальная ўласнасць Грамад і Паветаў.

3. Ад імя і ў інтарэсах тэрытарыяльных Грамад і Паветаў правы суб'екта камунальнай уласнасці ажыццяўляюць адпаведныя Рады і Сойміки. Аператыўнае

кіраванне камунальнай уласнасцю ажыццяўляюць Управы і іх структурныя падраздзяленні ў межах сваіх паўнамоцтваў.

4. Мясцовыя бюджэты самастойныя, яны не з'яўляюцца часткай Дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь і мясцовых бюджэтаў іншага ўзроўню.

5. Рада ў адпаведнасці з заканадаўствам можа надзяляць часткай сваіх паўнамоцтваў органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, а таксама перадаваць ім адпаведныя сродкі, матэрыяльна-тэхнічныя і іншыя рэсурсы, неабходныя для ажыццяўлення гэтых паўнамоцтваў, і кантраляваць іх выкананне.

6. Рады і Соймікі маюць пячаткі з выявай Дзяржаўнага Герба Рэспублікі Беларусь або мясцовага герба, сваім найменнем, рахункі ва ўстановах банкаў Рэспублікі Беларусь.

7. Тэрытарыяльныя Грамады могуць мець уласную сімволіку (герб, сцяг і іншыя сімвалы), якая адлюстроўвае іх гістарычныя, культурныя, сацыяльна-эканамічныя і іншыя мясцовыя асаблівасці і традыцыі.

8. Па ўзгадненні з тэрытарыяльнымі Грамадамі Соймікам можа быць зацверджана сімволіка адпаведнага Павета.

9. Змест, апісанне і парадак выкарыстання сімволікі тэрытарыяльных Грамад і Паветаў вызначаецца Законам Рэспублікі Беларусь «Аб сімвалах Рэспублікі Беларусь» і іх статутам.

## *Артыкул 8. Адносіны органаў мясцовага самакіравання з прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі, што знаходзяцца на тэрыторыі Грамад*

1. Адносіны органаў мясцовага самакіравання з прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі, што знаходзяцца ў камунальнай уласнасці адпаведных тэрытарыяльных Грамад, ажыццяўляюцца на прынцыпах іх падпарадкаванасці, падсправаздачнасці і падкантрольнасці органам мясцовага самакіравання

2. Па пытаннях, што адносяцца да вядзення органаў мясцовага самакіравання, прадпрыемствы, установы і арганізацыі, што не знаходзяцца ў камунальнай уласнасці адпаведных тэрытарыяльных Грамад, абавязаны выконваць рашэнні органаў мясцовага самакіравання і падаваць адпаведную інфармацыю.

## *Артыкул 9. Статут тэрытарыяльнай Грамады, Павета*

1. З мэтай абароны законных інтарэсаў грамадзян, уліку гістарычных, нацыянальна-культурных, сацыяльна-эканамічных, арганізацыйна-прававых і іншых асаблівасцяў ажыццяўлення мясцовага самакіравання прадстаўнічы орган мясцовага самакіравання на аснове Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і ў межах гэтага Закона прымае Статут тэрытарыяльнай Грамады, Павета.

2. Статут тэрытарыяльнай Грамады, Павета падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі.

3. Падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі Статута тэрытарыяльнай Грамады, Павета можа быць яго неадпаведнасць Канстытуцыі і законам

Рэспублікі Беларусь. Адмова ў рэгістрацыі Статута тэрытарыяльнай Грамады, Павета можа быць абскарджана ў судовым парадку.

## *Артыкул 10. Прававыя акты органаў мясцовага самакіравання*

1. Органы і службовыя асобы мясцовага самакіравання, у межах паўнамоцтваў, прадастаўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, выдаюць адпаведныя прававыя акты.

2. Прававымі актамі органаў і службовых асоб мясцовага самакіравання з'яўляюцца:

2.1. рашэнне Рады, Сойміка;

2.2. распараджэнне Старшыні Рады, Сойміка;

2.3. распараджэнне Старшыні Управы.

3. Парадак падрыхтоўкі, прыняцця, апублікавання, дзеяння, уліку і сістэматызацыі нарматыўных прававых актаў органаў мясцовага самакіравання вызначаецца гэтым Законам, Законам Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах у Рэспубліцы Беларусь», статутамі Грамады і Павета, Рэгламентам Рады (Сойміка) і іншымі нарматыўнымі актамі.

4. У частцы, не ўрэгуляванай асобнымі заканадаўчымі актамі, Рада (Соймік) могуць прымаць рашэнні, неабходныя для абароны жыцця або здароўя грамадзян і забеспячэння парадку, міру і грамадскай бяспекі. За іх парушэнне можа быць прадугледжаны штраф у парадку, устаноўленым Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб Адміністрацыйных Правапарушэннях.

5. У выключных выпадках, Старшыня Управы Грамады або Павета можа выдаваць прававы акт у выглядзе распараджэння. Распараджэнне падлягае зацвярджэнню на наступнай сесіі Рады. Распараджэнне губляе сваю сілу, калі Рада адмовіць у яго зацвярджэнні або яно не будзе прадстаўлена на бліжэйшую сесію. У такім выпадку Рада вызначае дату страты яго абавязковай сілы.

6. Нарматыўныя прававыя акты органаў мясцовага самакіравання могуць быць зменены толькі органам або службовай асобай, якая прыняла гэтыя рашэнні.

7. Рашэнне Рады і Сойміка можа быць адменена ў судовым парадку.

8. Органы дзяржаўнай улады, якія дэлегавалі органам мясцовага самакіравання асобныя свае паўнамоцтвы, могуць прыпыняць або (і) адмяняць рашэнні органаў мясцовага самакіравання, прынятыя ў межах перададзеных ім паўнамоцтваў.

9. Права прыпыняць і адмяняць прававыя акты Управы Грамады і Павета маюць адпаведна Рады і Сойміі, калі гэтыя акты супярэчаць іх рашэнням, а таксама суд - ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.

### *Артыкул 11. Абмежаванне правоў тэрытарыяльных Грамад і Паветаў на мясцовае самакіраванне*

Абмежаванне правоў тэрытарыяльных Грамад і Паветаў на мясцовае самакіраванне ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь допускаецца толькі ва ўмовах ваеннага або надзвычайнага становішча.

## ГЛАВА 2. ФАРМАВАННІ ПРАДСТАЎНІЧЫХ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ

### *Артыкул 12. Рады і Соймікі – прадстаўнічыя органы Грамад і Паветаў*

1. Рады і Соймікі з'яўляюцца прадстаўнічымі органамі мясцовага самакіравання тэрытарыяльных супольнасцяў, якія ажыццяўляюць ад іх імя і ў іх інтарэсах функцыі і паўнамоцтвы мясцовага самакіравання, вызначаныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым і іншымі законамі.

2. Рады і Соймікі дзейнічаюць у адпаведнасці з размежаваннем паўнамоцтваў у парадку і ў межах, вызначаных гэтым і іншымі законамі.

3. Парадак фармавання і арганізацыі дзейнасці Рад і Соймікаў вызначаюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым і іншымі законамі, а таксама статутамі Грамад і Паветаў.

4. Рады і Соймікі правамоцныя разглядаць і вырашаць пытанні, аднесеныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым і іншымі законамі да іх вядзення і кампетэнцыі.

5. Рады і Соймікі падсправаздачныя і адказныя перад грамадзянамі.

### *Артыкул 13. Фармаванне Рад і Соймікаў*

1. Рады і Соймікі складаюцца з дэпутатаў, якія выбіраюцца насельніцтвам адпаведнай тэрыторыі на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права шляхам таемнага галасавання.

2. Выбары дэпутатаў Рады праводзяцца па мажарытарнай сістэме.

3. Выбары дэпутатаў Соймікаў праводзяцца наступным чынам:

3.1. 50% дэпутатаў абіраюцца па мажарытарных акругах, якія ўтвараюцца ў адпаведнасці з законам;

3.2. 50% дэпутатаў абіраюцца па спісах палітычных партый.

4. Парадак арганізацыі і правядзення выбараў дэпутатаў вызначаецца законам.

5. Колькасны склад Рады вызначаецца ў адпаведнасці з Выбарчым Кодэксам Рэспублікі Беларусь.

6. Тэрмін паўнамоцтваў Рады, Сойміка - чатыры гады за выключэннем выпадку, прадугледжаных артыкулам 16 гэтага закона.

7. Паўнамоцтвы Рады, Сойміка пачынаюцца з дня адкрыцця першай пасля выбараў сесіі Рады, Сойміка і захоўваюцца да адкрыцця першай сесіі Рады, Сойміка новага склікання, за выключэннем выпадкаў датэрміновага спынення паўнамоцтваў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## Артыкул 14. Дэпутат Рады, Сойміка

1. Паўнамоцтвы дэпутата пачынаюцца з моманту афіцыйнага абвяшчэння адпаведнай тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй на сесіі Рады, Сойміка рашэння аб выніках выбараў і спыняюцца з моманту адкрыцця першай сесіі Рады, Сойміка новага склікання. Паўнамоцтвы дэпутата могуць быць спыненыя датэрмінова ў выпадках, прадугледжаных законам.

2. Дэпутат Рады, Сойміка прадстаўляе інтарэсы ўсёй тэрытарыяльнай Грамады або Павета, мае ўсю паўнату правоў, якія забяспечваюць яго актыўны ўдзел у дзейнасці Рады, Сойміка і органаў, якія імі ўтвараюцца, нясе абавязкі перад выбаршчыкамі, Радай, Соймікам і іх органамі, выконвае іх даручэнні. Дэпутат павінен уваходзіць у склад не менш як адной з пастаянных камісій Рады, Сойміка.

3. Старшыня Рады або Сойміка, іншыя дэпутаты па рашэнні Рады, Сойміка могуць працаваць на прафесійнай аснове.

4. Дэпутат абавязаны прымаць удзел у рабоце сесій Рады, Сойміка, пасяджэнняў пастаяннай і іншых камісій Рады, Сойміка, у склад якіх ён абраны.

5. Дэпутат мае права на выступленне па любых пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Рады, Сойміка ў парадку, устаноўленым у Рэгламенце.

6. Дэпутат мае права вырашальнага голасу па ўсіх пытаннях, якія разглядаюцца на сесіях Рады, Сойміка, а таксама на пасяджэннях пастаяннай і іншых камісій Рады (Сойміка), у склад якіх ён абраны.

7. Дэпутат мае права звяртацца з пісьмовым запытам да Старшыні і Прэзідыума Рады, Сойміка, службовых асобаў адпаведнай Управы, а таксама да кіраўніцтва камунальных прадпрыемстваў, да кіраўніцтва іншых прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі Рады, Сойміка.

8. Дэпутат мае права знаёміцца з афіцыйнымі дакументамі, якія захоўваюцца ў адпаведных органах мясцовага самакіравання, і рабіць выпіскі, капіраванне гэтых дакументаў у парадку, устаноўленым законам.

9. Паўнамоцтвы дэпутатаў, парадак арганізацыі і гарантыі дэпутацкай дзейнасці вызначаюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, законам аб статусе дэпутата, іншымі нарматыўнымі актамі.

## Артыкул 15. Органы Рады і Сойміка

Органамі Рады, Сойміка з'яўляюцца Старшыня Рады, Сойміка, Прэзідыум, пастаянныя і часовыя дэпутацкія камісіі, апарат Рады, Сойміка. Рада, Соймік

утвараюць свае пастаянныя органы не пазней чым у двухмесячны тэрмін з дня склікання першай сесіі, вызначаюць іх структуру і паўнамоцтвы, устанаўліваюць расходы на іх утрыманне ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

## *Артыкул 16. Датэрміновае спыненне паўнамоцтваў Рады Грамады, Сойміка*

1. Паўнамоцтвы Рады Грамады, Сойміка спыняюцца датэрмінова:

1.1. калі Грамада або Павет ліквідуецца ў выніку змянення адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення Рэспублікі Беларусь;

1.2. калі колькасць чальцоў Рады, Сойміка менш за дзве трэці ад установленай законам;

1.3. калі Рада, Соймік на працягу 3 месяцаў пасля прыняцця дзяржаўнага бюджэту не зацвердзіла бюджэт Грамады або Павета, складзены ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

1.4. калі Радзе, Сойміку на працягу 2 месяцаў не ўдалося абраць кіраўніка або прызначыць Старшыню Управы;

1.5. калі Рада, Соймік не прымала ніякіх рашэнняў на працягу больш за 6 месяцаў.

2. Пры роспуску Рады, Сойміка па прычынах, указаных у пункте 1 Урад Рэспублікі Беларусь уносіць у Сойм прапанову аб правядзенні датэрміновых выбараў у адпаведныя прадстаўнічыя органы ў тэрмін не больш за тры месяцы з моманту роспуску Рады.

3. Рада, Соймік, абраныя падчас пазачарговых выбараў, прызначаных у адпаведнасці з пунктам 1.4. дадзенага артыкула падлягаюць роспуску, калі на працягу шасці месяцаў не абяруць кіраўніка або не прызначаць Старшыню Управы. У гэтым выпадку датэрміновыя выбары не прызначаюцца. Пры неабходнасці да дня выбараў у Раду, Соймік наступнага склікання кіраўніцтва Управай ажыццяўляецца Упаўнаважаным Урада Рэспублікі Беларусь.

4. У выпадку парушэння Канстытуцыі ці неаднаразовага парушэння законаў Рэспублікі Беларусь Радай ці Соймікам, а таксама калі дзеяннем органа мясцовага самакіравання ствараецца пагроза суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці, ажыццяўленню канстытуцыйных паўнамоцтваў органамі дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь, Сойм Рэспублікі Беларусь па прапанове Урада у парадку, вызначаным Канстытуцыяй, можа прыняць рашэнне аб датэрміновых выбарах Рады, Сойміка.

# ГЛАВА 3. ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАДСТАЎНІЧЫХ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА САМАКІРАВАННЯ

## *Артыкул 17. Дзейнасць Рад і Соймікаў*

1. Рады і Соймікі ў сваёй дзейнасці па вырашэнні пытанняў мясцовага значэння зыходзяць з інтарэсаў грамадзян, прымаюць рашэнні ў межах вызначаных паўнамоцтваў і кампетэнцыі.

2. Рашэнні дзяржаўных органаў па пытаннях агульнадзяржаўнага значэння, якія закранаюць інтарэсы адной або некалькіх Грамад, павінны прымацца з улікам іх думкі.

3. Рады і Соймікі ажыццяўляюць сваю дзейнасць у форме сесій, праз дзейнасць сваіх органаў, а таксама шляхам рэалізацыі дэпутатамі Рады, Сойміка сваіх паўнамоцтваў, у тым ліку праз стварэнне і дзейнасць дэпутацкіх груп і фракцый.

4. Для арганізацыі работы Рада, Соймік прымаюць Рэгламент, у якім вызначаюцца парадак падрыхтоўкі, унясення і разгляду пытанняў на сесіях Рады, Сойміка і пасяджэннях яго органаў.

5. Пытанні, якія закранаюць інтарэсы сумежных тэрыторый, вырашаюцца адпаведнымі Радамі сумесна.

## *Артыкул 18. Старшыня Рады, Сойміка*

1. Дзейнасцю Рады, Сойміка кіруе Старшыня, падсправаздачны Радзе, Сойміку, якія яго абралі.

2. Старшыня Рады, Сойміка абіраецца з ліку дэпутатаў на сесіі адпаведнай Рады, Сойміка шляхам таемнага галасавання.

3. Кандыдатуры на пасаду Старшыні Рады, Сойміка ўносяцца дэпутатамі, групамі дэпутатаў, дэпутацкімі фракцыямі адпаведнай Рады, Сойміка. Старшыня Рады, Сойміка лічыцца абраным, калі за яго кандыдатуру прагаласавала больш за палову ад ліку абраных дэпутатаў.

4. Паўнамоцтвы Старшыні Рады, Сойміка заканчваюцца ў дзень адкрыцця першай сесіі адпаведнай Рады, Сойміка, абранай на чарговых мясцовых выбарах, акрамя выпадкаў датэрміновага спынення яго паўнамоцтваў у адпаведнасці з артыкулам 16 гэтага Закона.

5. У выпадку звальнення з пасады ў сувязі з датэрміновым спыненнем паўнамоцтваў Старшыні Рады, Сойміка і да моманту пачатку паўнамоцтваў абранага на пазачарговых выбарах у адпаведнасці з законам Старшыні Рады, Сойміка або да дня адкрыцця першай сесіі адпаведнай Рады, Сойміка паўнамоцтвы Старшыні ажыццяўляе намеснік.

## Артыкул 19. Датэрміновае спыненне паўнамоцтваў Старшыні Рады, Сойміка

1. Паўнамоцтвы Старшыні Рады Грамады, Сойміка лічацца датэрмінова спыненымі ў выпадку:

1.1. звароту з асабістай заявай у адпаведную Раду, Соймік аб складанні ім паўнамоцтваў Старшыні;

1.2. спынення грамадзянства;

1.3. уступлення ў законную сілу прысуду, звязанага з абмежаваннем або пазбаўленнем волі;

1.4. уступлення ў законную сілу рашэння суда аб прыцягненні да адказнасці за карупцыйнае правапарушэнне, якое пацягнула спагнанне ў выглядзе пазбаўлення права займаць пасады або ажыццяўляць дзейнасць, звязаную з выкананнем функцый дзяржавы або мясцовага самакіравання;

1.5. па рашэнні Рады, Сойміка;

1.6. прызнання судом недзеяздольным, без вестак зніклым або абвяшчэння памерлым;

1.7. у сувязі са смерцю.

2. Датэрміновае спыненне паўнамоцтваў Старшыні Рады цягне за сабой яго вызваленне ад пасады.

## Артыкул 20. Кампетэнцыі Старшыні Рады, Сойміка

1. Старшыня Рады, Сойміка:

1.1. узначальвае Раду, Соймік кіруе яе (яго) працай, забяспечвае ўзаемадзеянне з адпаведнай управай;

1.2. прадстаўляе Раду, Соймік ва ўзаемаадносінах з іншымі Радамі, Соймікамі і дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі і грамадзянамі;

1.3. зацвярджае штатны расклад адпаведнай Рады, Сойміка;

1.4. склікае сесіі Рады, Сойміка арганізуе працу па падрыхтоўцы сесій Рады, Сойміка, вядзе паседжанні Рады, Сойміка;

1.5. арганізуе кантроль за выкананнем рашэнняў Рады, Сойміка;

1.6. назначае на пасады і вызваляе ад пасад работнікаў апарата Рады, Сойміка, заключае (працягвае, скасоўвае) з імі працоўныя дамовы (кантракты), прымяняе да іх меры заахвочвання і дысцыплінарнай адказнасці, прымае іншыя рашэнні ў адпаведнасці з працоўным заканадаўствам і Статутам;

1.7. запрашае на пасяджэнні Рады, Сойміка зацікаўленых юрыдычных і фізічных асоб;

1.8. накіроўвае на заключэнне пастаянных камісій праекты рашэнняў Рады, Сойміка, дае даручэнні старшыням пастаянных камісій;

1.9. падпісвае рашэнні, пратаколы пасяджэнняў Рады, Сойміка, выдае распараджэнні;

1.10. арганізуе разгляд запытаў дэпутатаў Рады, Сойміка;

1.11. арганізуе работу Рады, Сойміка па разглядзе зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, вядзенне кнігі заўваг і прапаноў, ажыццяўленне адміністрацыйных працэдур. Пры неабходнасці ўносіць прапановы па такіх зваротах на разгляд сесіі Рады, Сойміка;

1.12. ажыццяўляе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб;

1.13. дакладвае Радзе, Сойміку аб стане справаў на тэрыторыі Грамады, Павета, прадстаўляе сесіі Рады, Сойміка не радзей за адзін раз на год справаздачу аб сваёй дзейнасці, інфармуе грамадзян аб стане спраў на адпаведнай тэрыторыі;

1.14. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

2. Старшыня Рады, Сойміка не можа займацца іншымі відамі дзейнасці, акрамя навуковай і выкладчыцкай дзейнасці.

## *Артыкул 21. Прэзідыум Рады, Сойміка*

1. Рада, Соймік могуць утварыць прэзідыум. Прэзідыум Рады, Сойміка з'яўляецца дарадчым органам Рады, Сойміка, які папярэдне рыхтуе ўзгодненыя прапановы і рэкамендацыі па пытаннях, якія мяркуецца ўнесці на разгляд Рады, Сойміка. Прэзідыум Рады, Сойміка можа прымаць рашэнні, якія маюць дарадчы характар.

2. У склад прэзідыума ўваходзяць Старшыня Рады, Сойміка, намеснікі Старшыні, старшыні пастаянных камісій Рады, Сойміка, упаўнаважаныя прадстаўнікі дэпутацкіх груп і фракцый.

3. Прэзідыум Рады, Сойміка дзейнічае на аснове Палажэння аб ім, якое зацвярджаецца Радай, Соймікам.

4. Прэзідыум прызначае даты сесій Рады і Сойміка, фармуе праект парадку дня сесіі.

## *Артыкул 22. Пастаянныя камісіі Рады, Сойміка*

1. Для папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі рашэнняў па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі Рады, Сойміка, а таксама арганізацыі і кантролю за выкананнем рашэнняў на сесіях Рады, Сойміка з ліку дэпутатаў ствараюцца пастаянныя камісіі Рады, Сойміка.

2. Парадак фармавання і працы пастаянных камісій Рады, Сойміка, а таксама іх пералік вызначаецца Рэгламентам Рады, Сойміка. Пастаянная камісія па бюджэце з'яўляецца абавязковай.

3. Працу пастаянных камісій арганізуюць іх старшыні, якія абіраюцца на сесіі Рады, Сойміка.

4. У пасяджэнні пастаяннай камісіі Рады, Сойміка могуць прымаць удзел з дарадчым голасам іншыя дэпутаты, запрошаныя старшынёй камісіі дэпутаты іншых Рад, Соймікаў, эксперты і іншыя спецыялісты, дэпутаты Сойма.

## *Артыкул 23. Кампетэнцыя прадстаўнічых органаў мясцовага самакіравання*

1. Кампетэнцыя органаў мясцовага самакіравання дзеліцца на ўласную і дэлегаваную.

2. Уласная кампетэнцыя ахоплівае пытанні мясцовага значэння і выконваецца толькі органамі мясцовага самакіравання:

2.1. арганізацыя і рэгуляванне гарадской забудовы;

2.2. рамонт дарог і вуліц;

2.3. добраўпарадкаванне гарадскіх тэрыторый;

2.4. дашкольнае выхаванне і школьная адукацыя;

2.5. сацыяльная дапамога і абарона дзяцей, інвалідаў, пенсіянераў;

2.6. ахова здароўя і першасная медыцынская дапамога і іншыя пытанні мясцовага значэння.

3. Дэлегаванне кампетэнцый ажыццяўляецца ў адпаведнасці з законам, з умовай перадачы фінансавых і іншых рэсурсаў, неабходных для іх выканання.

4. Кампетэнцыя Рады і Сойміка замацоўваецца законам.

## *Артыкул 24. Рашэнні Рады, Сойміка*

1. Па пытаннях, разгледжаных на сесіях, Рада, Соймік прымае рашэнні.

2. Сесія лічыцца правамоцнай, калі прысутнічае большасць ад колькасці абраных дэпутатаў.

3. Рашэнні Рады, Сойміка прымаюцца на сесіі простай большасцю галасоў ад колькасці абраных дэпутатаў таемным або адкрытым галасаваннем, у тым ліку паіменным.

4. Форма галасавання вызначаецца ў парадку, устаноўленым Рэгламентам Рады, Сойміка.

## *Артыкул 25. Кампетэнцыі Сойміка*

1. Да кампетэнцыі Сойміка адносяцца наступныя пытанні:

1.1. рэгіянальнае развіццё:

1.1.1. забеспячэнне збалансаванага эканамічнага і сацыяльнага развіцця адпаведнай тэрыторыі, эфектыўнага выкарыстання прыродных, працоўных і фінансавых рэсурсаў;

1.1.2. падрыхтоўка прапановаў да праграм сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Павета;

1.1.3. падрыхтоўка прапановаў да агульнадзяржаўных праграм эканамічнага, навукова-тэхнічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь;

1.1.4. падрыхтоўка і прадстаўленне ў адпаведныя органы выканаўчай улады фінансавых паказчыкаў і прапановаў да праекту Дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь;

1.1.5. садзейнічанне інвестыцыйнай дзейнасці на тэрыторыі Павета;

1.1.6. падрыхтоўка заключэнняў па праектах мясцовых горадабудаўнічых праграм адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, якія зацвярджаюцца сельскімі, пасялковымі, гарадскімі Радамі;

1.1.7. выдача замоўцам у адпаведнасці з заканадаўствам горадабудаўнічых умоваў і абмежаванняў забудовы зямельных участкаў, размешчаных на тэрыторыях тэрытарыяльных супольнасцяў, у якіх не створаныя ўпаўнаважаныя органы горадабудаўніцтва і архітэктуры;

1.2. ахова навакольнага асяроддзя:

1.2.1. планаванне і рэалізацыя мерапрыемстваў па ахове навакольнага асяроддзя;

1.2.2. узгадненне (у выпадках, прадугледжаных законам) з прадстаўнічымі органамі Грамад пытанняў размеркавання сродкаў за выкарыстанне прыродных рэсурсаў, якія паступаюць у фонды аховы навакольнага прыроднага асяроддзя;

1.2.3. падрыхтоўка праектаў рашэнняў аб аднясенні лясоў да катэгорыі абароненасці, а таксама аб дзяленні лясоў па разрадах такс у выпадках і парадку, прадугледжаных законам;

1.2.4. прыняцце ва ўстаноўленым законам парадку рашэнняў аб забароне выкарыстання асобных прыродных рэсурсаў агульнага карыстання;

1.2.5. вызначэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам рэжыму выкарыстання тэрыторый рэкрэацыйных зон;

1.2.6. зацвярджэнне для прадпрыемстваў, установаў і арганізацый, размешчаных на адпаведнай тэрыторыі, лімітаў выкідаў і скідаў забруджвальных рэчываў у навакольнае асяроддзе і лімітаў размяшчэння адходаў у выпадках, прадугледжаных законам;

1.3. развіццё рэгіянальнай інфраструктуры, перш за ўсё аўтамабільных дарог (за выключэннем дарог, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці), сеткі пасажырскіх перавозак (за выключэннем сетак унутры супольнасцяў) агульнага карыстання:

1.3.1. будаўніцтва, рэканструкцыя, рамонт і ўтрыманне аб'ектаў сацыяльнай і вытворчай інфраструктуры, дарог рэгіянальнага (павятовага) значэння;

1.3.2. зацвярджэнне маршрутаў і графікаў руху мясцовага пасажырскага транспарту незалежна ад формаў уласнасці, узгадненне гэтых пытанняў адносна транзітнага пасажырскага транспарту;

1.3.3. вызначэнне ў адпаведнасці з законам памеру адлічэнняў прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі, якія паступаюць на развіццё дарог агульнага карыстання ў Павеце;

1.4. развіццё культуры, спорту, турызму:

1.4.1. арганізацыя аховы, рэстаўрацыі, выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, архітэктуры і горадабудаўніцтва, палацава-паркавых, паркавых і сядзібных комплексаў, прыродных запаведнікаў павятовага значэння;

1.4.2. забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам развіцця навукі, усіх відаў адукацыі, аховы здароўя, культуры, фізічнай культуры і спорту, турызму; садзейнічанне адраджэнню асяродкаў традыцыйнай народнай творчасці, нацыянальна-культурных традыцый насельніцтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў, працы творчых саюзаў, нацыянальна-культурных таварыстваў, асацыяцый, іншых грамадскіх і непрыбытковых арганізацый, якія дзейнічаюць у сферы адукацыі, аховы здароўя, культуры, фізічнай культуры і спорту, сям'і і моладзі;

1.4.3. падрыхтоўка і прадстаўленне на зацвярджэнне Сойміка прапаноў па арганізацыі тэрыторый і аб'ектаў прыродна-запаведнага фонду мясцовага значэння і іншых тэрыторый, якія падлягаюць асаблівай ахове; унясенне прапаноў у адпаведныя дзяржаўныя органы аб аб'яўленні прыродных і іншых аб'ектаў, якія маюць экалагічную, гістарычную, культурную або навуковую каштоўнасць, помнікамі гісторыі або культуры, якія ахоўваюцца законам;

1.5. каардынацыя дзейнасці Грамад, накіраваных на ліквідацыю наступстваў надзвычайных сітуацый у маштабах Павета:

1.5.1. прыняцце неабходных мер па ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый у адпаведнасці з законам, інфармаванне аб іх насельніцтва, прыцягненне ва ўстаноўленым законам парадку да гэтых работ прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама насельніцтва;

1.6. арганізацыя дзейнасці і кіраванне ўстановамі прафесійна-тэхнічнай, сярэднеспецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з законам;

1.7. арганізацыя прадастаўлення высокаспецыялізаванай і экстранай медыцынскай дапамогі;

1.8. іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя законам.

## Артыкул 26. Выключная кампетэнцыя Рады і Сойміка

1. Выключна на пленарных пасяджэннях Рады і Сойміка вырашаюцца наступныя пытанні:

1.1. абранне Старшыні Рады, Сойміка і іх намеснікаў, вызваленне іх ад пасады;

1.2. утварэнне і ліквідацыя пастаянных і іншых камісій Рады, Сойміка, змяненне іх складу, абранне старшынь камісій;

1.3. утварэнне прэзідыума Рады, Сойміка, зацвярджэнне палажэння аб прэзідыуме;

1.4. зацвярджэнне па прапанове Старшыні адпаведнай Рады, Сойміка структуры апарата Рады, Сойміка, яго колькасным складам, устаноўленай у адпаведнасці з тыпавымі штатамі, зацверджанымі Урадам Рэспублікі Беларусь, расходаў на ўтрыманне Рады, Сойміка;

1.5. зацвярджэнне па прапанове Старшыні Рады, Сойміка Старшыні Управы Грамады, Павета, кіраўнікоў упраўленняў, аддзелаў (пры адсутнасці ўпраўленняў) Управы;

1.6. зацвярджэнне па прапанове Старшыні Управы адпаведнай Рады, Сойміка структуры і апарата Управы, яго колькасці, устаноўленай у адпаведнасці з тыпавымі штатамі, зацверджанымі Урадам Рэспублікі Беларусь, расходаў на ўтрыманне Управы;

1.7. зацвярджэнне рэгламенту Рады, Сойміка;

1.8. зацвярджэнне плана працы Рады, Сойміка і заслухоўвання справаздачы Старшыні аб яго выкананні;

1.9. заслухоўванне справаздач пастаянных і іншых камісій, кіраўнікоў выканаўчых органаў Рады, Сойміка і службовых асоб, якіх яны прызначаюць або зацвярджаюць;

1.10. прыняцце рашэння аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў Старшыні Рады, яго намесніка, Старшыні Сойміка, яго намесніка ў выпадках, прадугледжаных гэтым Законам;

1.11. разгляд запытаў дэпутатаў, прыняцце рашэнняў па запытах;

1.12. прыняцце рашэнняў аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў дэпутата Рады, Сойміка ў парадку, устаноўленым законам;

1.13. прыняцце рашэнняў па пытаннях адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання ў межах і ў парадку, вызначаных законам;

1.14. прыняцце ў адпаведнасці з заканадаўствам рашэнняў адносна арганізацыі правядзення рэферэндумаў і выбараў органаў дзяржаўнай улады, мясцовага самакіравання.

1.15. адмена актаў выканаўчых органаў, якія не адпавядаюць Канстытуцыі або законам Рэспублікі Беларусь, іншым актам заканадаўства, рашэнню адпаведнай Рады, Сойміка, прынятым у межах яе паўнамоцтваў;

1.16. зацвярджэнне праграм сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, мэтавых праграм па іншых пытаннях мясцовага самакіравання;

1.17. разгляд прагнозу мясцовага бюджэту, зацверджанне мясцовага бюджэту, унясенне змен у яго; зацверджанне справаздачы аб выкананні адпаведнага бюджэту;

1.18. адукацыя мэтавых фондаў, зацверджанне палажэнняў аб гэтых фондах;

1.19. рашэнне ў адпаведнасці з законам пытанняў рэгулявання зямельных адносін;

1.20. заслухоўванне інфармацыі пракурораў і кіраўнікоў органаў Міністэрства ўнутраных справаў, аб стане справаў у сферы барацьбы са злачыннасцю, аховы грамадскай бяспекі і парадку і выніках іх дзейнасці на адпаведнай тэрыторыі;

1.21. зацверджанне ў адпаведнасці з законам Палажэння аб змесце, апісанні і парадку выкарыстання сімволікі Грамады і Павета;

1.22. заснаванне электронных сродкаў публічнай інфармацыі адпаведнай Рады, Сойміка, прызначэнне і вызваленне іх кіраўнікоў;

1.23. прыняцце рашэнняў аб ажыццяўленні мясцовых запазычанняў.

## *Артыкул 27. Асаблівасці выключных паўнамоцтваў Рады*

1. Выключна на пленарных пасяджэннях Рады ажыццяўляецца:

1.1. зацверджанне статута тэрытарыяльнай абшчыны;

1.2. устанаўленне мясцовых падаткаў і збораў у адпаведнасці з Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь;

1.3. прыняцце рашэння аб правядзенні мясцовага рэферэндуму;

1.4. прыняцце рашэнняў аб надзяленні органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання асобнымі ўласнымі паўнамоцтвамі органаў мясцовага самакіравання, а таксама аб перадачы сродкаў, матэрыяльна-тэхнічных і іншых рэсурсаў, неабходных для іх ажыццяўлення;

1.5. прыняцце рашэння аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў выпадках, прадугледжаных Законам;

1.6. утварэнне старасцінскіх акруг, зацверджанне Палажэння аб Старасце, зацверджанне на пасаду і вызваленне ад пасады Старасты ў адпаведнасці з законам;

1.7. прыняцце рашэнняў аб аб'яднанні ў асацыяцыі або ўступленне ў асацыяцыі, іншыя формы добраахвотных аб'яднанняў органаў мясцовага самакіравання і аб выхадзе з іх;

1.8. прыняцце рашэнняў аб стварэнні аб'яднання еўрарэгіянальнага супрацоўніцтва, аб далучэнні да такога аб'яднання або аб выхадзе з яго, зацверджанне статута аб'яднання еўрарэгіянальнага супрацоўніцтва і ўнясенне ў яго зменаў;

1.9. устанаўленне для прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якія адносяцца да камунальнай уласнасці, адпаведных тэрытарыяльных супольнасцяў, памеру часткі прыбытку, які падлягае залічэнню ў мясцовы бюджэт;

1.10. зацверджанне ставак зямельнага падатку згодна з Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь

1.11. прыняцце рашэнняў аб прадастаўленні ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам ільгот па мясцовых падатках і зборах, а таксама па зямельным падатку;

1.12. прыняцце рашэнняў аб адчужэнні камунальнай маёмасці ў адпаведнасці з законам;

1.13. зацверджанне мясцовых праграм прыватызацыі, а таксама пераліку аб'ектаў камунальнай уласнасці, якія не падлягаюць прыватызацыі;

1.14. вызначэнне мэтазгоднасці, парадку і ўмоваў прыватызацыі аб'ектаў камунальнай уласнасці;

1.15. ажыццяўленне іншых дзеянняў адносна камунальнай уласнасці ў адпаведнасці з законам;

1.16. стварэнне, рэарганізацыя ці ліквідацыя навучальных установаў камунальнай формы ўласнасці;

1.17. здзяйсненне дзеянняў у дачыненні да прадпрыемстваў, у статутным капітале якіх больш за 50 адсоткаў акцый (доляў) належаць тэрытарыяльнай супольнасці ў акрэсленым законам парадку;

1.18. прыняцце рашэнняў аб перадачы іншым органам і арганізацыям асобных паўнамоцтваў па кіраванні маёмасцю, якая з'яўляецца камунальнай уласнасцю адпаведнай тэрытарыяльнай супольнасці, вызначэнне межаў гэтых паўнамоцтваў і ўмоваў іх ажыццяўлення;

1.19. рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам пытанняў аб стварэнні прадпрыемствамі камунальнай уласнасці сумесных прадпрыемстваў, у тым ліку з замежнымі інвестыцыямі;

1.20. прыняцце рашэнняў аб арганізацыі тэрыторый і аб'ектаў прыродна-запаведнага фонду мясцовага значэння і іншых тэрыторый, якія падлягаюць асаблівай ахове; унясенне прапановаў у адпаведныя дзяржаўныя органы аб аб'яўленні прыродных і іншых аб'ектаў, якія маюць экалагічную, гістарычную, культурную або навуковую каштоўнасць, помнікамі прыроды, гісторыі або культуры, якія ахоўваюцца законам;

1.21. прадастаўленне ў адпаведнасці з заканадаўствам згоды на размяшчэнне на тэрыторыі вёскі, пасёлка, горада новых аб'ектаў, у тым ліку месцаў або аб'ектаў для размяшчэння адходаў, сфера экалагічнага ўплыву дзейнасці якіх згодна з дзейнымі нарматывамі ўключае адпаведную тэрыторыю;

1.22. зацверджанне ва ўстаноўленым парадку мясцовых горадабудаўнічых праграм, генеральных планаў забудовы адпаведных населеных пунктаў, іншай горадабудаўнічай дакументацыі;

1.23. устанаўленне забароны продажу алкагольных, слабаалкагольных напояў, він сталовых суб'ектамі гаспадарання (акрамя ўстановаў рэстараннай гаспадаркі) у пэўны час сутак у межах тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

1.24. устанаўленне ў адпаведнасці з заканадаўствам правілаў па пытаннях добраўпарадкавання тэрыторыі населенага пункта, забеспячэнне ў ім чысціні і парадку, гандлю на рынках, за парушэнне якіх прадугледжана адміністрацыйная адказнасць;

1.25. прыняцце ў межах, вызначаных законам, рашэнняў па пытаннях барацьбы са стыхійнымі бедствамі, эпідэміямі, эпізаатыямі, за парушэнне якіх прадугледжана адміністрацыйная адказнасць;

1.26. дача згоды на перадачу аб'ектаў з дзяржаўнай у камунальную ўласнасць і прыняцце рашэнняў аб перадачы аб'ектаў з камунальнай у дзяржаўную ўласнасць, а таксама аб набыцці аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці;

1.27. вырашэнне пытанняў у сферы абыходжання з небяспечнымі адходамі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

2. Рады могуць разглядаць і вырашаць на пленарных паседжаннях і іншыя пытанні, аднесеныя да іх вядзення гэтым і іншымі законамі.

### *Артыкул 28. Асаблівасці выключных паўнамоцтваў Сойміка*

1. Да выключных паўнамоцтваў Сойміка адносяцца:

1.1. вырашэнне пытанняў аб продажы, перадачы ў арэнду, пад заклад аб'ектаў камунальнай уласнасці або прыняцця рашэння аб ажыццяўленні дзяржаўна-прыватнага партнёрства па аб'ектах камунальнай уласнасці, у тым ліку на ўмовах канцэсіі, якія забяспечваюць агульныя патрэбы тэрытарыяльных супольнасцяў і якія знаходзяцца ва ўпраўленні Соймікаў, а таксама набыццё такіх аб'ектаў у вызначаным законам парадку;

1.2. вырашэнне ў вызначаным законам парадку пытанняў кіравання аб’ектамі агульнай уласнасці тэрытарыяльных Грамад сёлаў, пасёлкаў, гарадоў, раёнаў у гарадах, якія знаходзяцца пад кіраваннем Сойміка; прызначэнне і вызваленне іх кіраўнікоў;

1.3. устанаўленне правілаў карыстання водазаборнымі збудаваннямі, прызначанымі для задавальнення пітных, побытавых і іншых патрэбнасцяў насельніцтва, зон санітарнай аховы крыніц водазабеспячэння, абмежавання або забароны выкарыстання прадпрыемствамі пітнай вады ў прамысловых мэтах;

1.4. унясенне прапановаў у адпаведныя дзяржаўныя органы аб аб'яўленні прыродных і іншых аб'ектаў, якія маюць экалагічную, гістарычную, культурную або навуковую каштоўнасць, помнікамі гісторыі або культуры, якія ахоўваюцца законам;

1.5. прыняцце ў адпаведнасці з законам, па прапанове адпаведных Рад рашэнняў, звязаных са стварэннем спецыяльных свабодных і іншых зон, змяненнем у статусе гэтых зон, унясенне ў адпаведныя органы прапановаў па гэтых пытаннях;

